***В. М. Голуб***
Навуковы кіраўнік — *А. І. Белая,* кандыдат педагагічных навук, дацэнт
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

# МАРАЛЬНА-ЭТЫЧНЫ КОДЭКС «ЧАЛАВЕКА З РУЖЖОМ» У ТВОРАХ А. ГАРУНА І М. ГАРЭЦКАГА

XX стагоддзе стала часам грандыёзных узрушэнняў, перамен як у сацыяльнай, навукова-тэхнічнай, так і эстэтычнай сферах. Два найбольш прыкметныя фактары — сацыяльны і нацыянальны — самым вызна-чальным чынам уздзейнічалі на характар і развіццё эстэтычных ідэй новага стагоддзя, на працэс фарміравання сістэмы мастацкай культуры, грамадскіх і светапоглядных адносін. Адносна Першай сусветнай вайны ў поўнай меры праўдзівы афарызм «Вайна — зімовая спячка культуры». Калі гаварыць пра маладую беларускую літаратуру, то падзеі гэтага перыяду ў ёй асэнсоўваліся пераважна ў паэтычных жанрах, на эмацыянальна-экспрэсіўным узроўні. Найбольш значныя набыткі прозы звязаны з творчасцю пісьменнікаў — непасрэдных удзельнікаў падзей, і асабліва М. Гарэцкага. У пачатку ліпеня 1914 года малады пісьменнік быў прызначаны праходзіць вайсковую службу ў артылерыйскую брыгаду, у гэтым жа месяцы пачалася Першая сусветная вайна. Займацца творчасцю даводзілася толькі прыхапкамі, а то і ўпотай, па формуле: у адной руцэ — вінтоўка, у другой — пяро. Трохгадовая служба салдата і празаіка М. Гарэцкага ў арміі адыграла бясспрэчную ролю найперш у тым, што адкрыла новую — ваенную — тэму не толькі ў яго творчасці, але і ў беларускай прозе ў цэлым. У скарбонцы тагачаснай беларускай прозы твораў пра вайну проста не было, таму М. Гарэцкаму даводзілася ўзнаўляць свой вайсковы вопыт без аніякай апоры на нацыянальную мастацкую традыцыю: у яго асобе гэтая традыцыя толькі пачала персаніфікавацца [1, с. 51]. Можна вылучыць дзве тэндэнцыі ў адлюстраванні падзей Першай сусветнай вайны. Гэта, у першую чаргу, адлюстраванне прыкладаў неадэкватных характару чалавека паводзін у сітуацыі пераходу ад мірнага да ваеннага жыцця, а таксама паводзін, неадэкватных самой сітуацыі, у чым ужо і пачынае выяўляцца яе дэструктыўнае ўздзеянне на асобу. Выяўляецца разуменне салдатам «абясчалавечвання» на вайне, яе згубнага ўздзеяння на чалавека і яго здароўе, у тым ліку псіхалагічнае. Але больш значнае месца ў беларускай літаратуры дадзенага перыяду займае другая тэндэнцыя — «кругі ад вайны». А гэта стаўленне да вайны ў тыле, у беларускай вёсцы, звязаныя з вайной перамены, жаночы і сірочы лёс [2, с. 142]. Аб’ектам аналізу ў нашым артыкуле выступілі верш А. Гаруна «Праводзіны» і апавяданне М. Гарэцкага «Рускі», у якіх адпаведна адбіліся абедзве гэтыя тэндэнцыі. Калі лірычны твор па-мастацку сцвярджае своеасаблівы этычны кодэкс чалавека на вайне, то эпічны паказвае яго складаны маральна-псіхалагічны стан, што прыводзіць да парушэння спрадвечных чалавечых устанаўленняў.

Без уліку спадчыны А. Гаруна ўяўленне аб літаратурным працэсе перыяду Першай сусветнай вайны будзе няпоўным, бо паэт паказаў бесчалавечны, антыгуманны характар вайны адразу пасля яе пачатку, калі яна яшчэ не паспела спустошыць беларускую зямлю і заліць яе крывёю [4, с. 322]. А. Гарун высока цаніў чалавечае ў чалавеку. Асуджаючы вайну, ён разам з тым рэпрэзентаваў маральны кодэкс паводзін чалавека на вайне — кодэкс гуманізму, чалавечнасці, міласэрнасці, заснаваны на шматвяковых прынцыпах хрысціянскай маралі. Звяртаючыся да нававбранца, лірычны герой дае яму запавет: «Быў чалавекам ты, браце, у нас, / Будзь чалавекам і там» [5, с. 120]. Паэт падкрэсліў антыгуманную сутнасць вайны, якой няма ніякага апраўдання. Але кожны мужчына, разам з тым, павінен выканаць свой абавязак абаронцы: «Сорам і ганьба для свету вайна, / Як ні мяркуй, ні судзі; / З боскіх законаў смяецца яна… / Мусіш, аднак жа… Ідзі!» [5, с. 119]. А. Гарун нібы паказвае магчымасць братання салдат варожых армій (што і выявілі пазнейшыя падзеі Першай сусветнай вайны) і бачыць агульнасць іх чалавечага і салдацкага лёсу (тую самую магчымасць братання ўбачым і ў Гарэцкага, але яна ўжо паўстане як безвыходнае становішча). У звароце да нававбранца гучыць наказ берагчы годнасць і сумленне ў любых умовах, бачыць у асобе варожага салдата перш за ўсё чалавека, які таксама ідзе ваяваць не па ўласнай волі: «Будзе праціўнік пабіты ляжаць, / Ты пашкадуй яго, брат! / Раны завяжаш, паможаш устаць, — / Й ён чалавек і салдат» [5, с. 120]. У вершы А. Гаруна выяўляецца гуманістычнае светабачанне аўтара, яго непаўторная здольнасць увасобіць у мастацкім слове найбольш каштоўныя прынцыпы народнай маралі, якія непадуладны афіцыйнай дзяржаўнай шавіністычнай ідэалогіі [4, с. 322]. «Старасці, цноце не помні ўраз, / Гэтым сумлення не плям…» [5, с. 120]. Разам з тым няма ў лірычнага героя апраўдання для баязлівасці: «Смелага сэрца не колюць штыкі, кулі яго не праб’юць» [5, с. 120]. Натуральнасць аўтарскай інтанацыі, тое, што паэт апавядае зразумелай і ў той жа час вобразнай паэтычнай мовай, шчыра, задушэўна перадае душэўны стан лірычнага героя і складанасць яго жыццёвай сітуацыі, наводзіць чытача на сур’ёзны роздум і развагу аб важнейшых пытаннях чалавечага жыцця.

Перш чым асэнсоўваць нейкі факт, пісьменніку неабходна здабыць яго, увесці ў сістэму падобных фактаў, падсумаваць іх, ацаніць як мастацкую верагоднасць і толькі тады выбраць адпаведную форму выкладу. Таму праца М. Гарэцкага пачыналася з дзённіка, які, складаючыся з асобных назіранняў, толькі з гадамі перарастаў у эпічны твор канкрэтнай формы. З дзённікавых нататак выраслі і апавяданні аб Першай сусветнай вайне («Рускі», «Літоўскі хутарок» і інш.) [1, с. 69]. У апавяданні «Рускі» звернута ўвага на псіхалагічны стан салдата, які неразважліва загубіў сабе падобнага [1, с. 59]. Праблематыка апавядання досыць арыгінальная. Гераічны аспект, які так настойліва распрацоўваецца «ваеннай» літаратурай свету, цалкам выпадае з поля зроку аўтара. Тут на першым месцы будзённы бок вайны. Герой зрабіўся ўскоснай ахвярай вайны: ён пайшоў

Рэпазіторый БарДУ

на забойства ціхамірнага «аўстрыяка» праз духоўную і інтэлектуальную нясталасць, праз страх перад начальствам і нежаданне быць западозраным у баязлівасці [3, с. 390]. М. Гарэцкі паспрабаваў разабрацца ў цёмнай чалавечай натуры, даць ёй магчымасць самастойна праявіць сябе. Гэта вобраз замкнёнага ў сабе салдата-маўчуна, чалавека зямлі, якога адарвалі ад гэтай зямлі, кінулі ў вір незразумелага яму ваеннага жыцця. Ён і на фронце ў часы зацішша блукае па зямлі — ды не дзе-небудзь, а па нейтральнай паласе — у пошуках «спажывы», выкопваючы бульбу [7, с. 120]. «І на пазіцыі, у часе доўгага і спакойнага стаяння ў зацішку малаважнага фронту, болей за другіх сваіх таварышаў любіў Рускі туляцца па пустых, кінутых сялянскіх дварах і поркацца там шукаючы пажытку» [6]. М. Гарэцкі паказаў, як неўсвядомлена цёмнае, агрэсіўнае ўзяло верх над чалавечым пачуццём [3, с. 390]. Спачатку Рускі называе «аўстрыяка» браткам, яны вітаюцца, «як даўныя сябры», Рускі п’е аўстрыякаву гарэлку, а потым у яго раптам бліснула думка: «Э, што ж я за ваяка…» [5]. Калі ўжо цёмны бок чалавечай натуры перамог, аўстрыякавы апошнія словы былі: «Што ж цій москаль наробыв... Застанэцца моя жынка і діты…». Гэты эпізод твора М. Гарэцкага знаходзіцца ў рэзкім кантрасце з ідэяй верша А. Гаруна, у якім гаворыцца пра чалавечую літасць і спагаду да параненых ворагаў: «Помста ці хцівасць цябе як штурхне, / Успомні сямейку сваю» [4, с. 120]. Мы бачым, аднак, што Рускі раскайваецца. У шпіталі «ён горка плакаў і жаліўся, што яму ўсё нешта здаецца». Салдат усвядоміў бесчалавечнасць характару свайго ўчынку, вынікам чаго стала «цяжкая хвароба, і мука, і безнадзейнасць» [6]. Ён спрабуе апраўдацца перад самім сабой, суцішыць дакор сумлення. «Калі яго забірае хвароба, крычыць шмат разоў бесперастанку: — Я рускі! Я рускі! Рускі, рускі!» [6]. Гэтым воклічам хворы хоча далучыць сябе да тых, хто ваюе за Расею-матухну, за «веру, цара і айчыну», хто бароніць яе інтарэсы. Асабістая, персанальная віна салдата тут нібы падзелена на ўсіх воінаў рускай арміі пароўну і робіцца віной калектыўнай [3, с. 390]. М. Гарэцкі спачуваў герою як ахвяры несправядлівага сацыяльнага ладу, канкрэтных грамадскіх умоў, але і на ўвесь голас гаварыў пра асабістую адказнасць чалавека за свае ўчынкі, справы, паводзіны — адказнасць перад жыццём, перад нашчадкамі і будучыняй. Пэўная доля віны і маральнай адказнасці была і ў салдата, на сумленні якога жыццё «аўстрыяка» [3, с. 392]. У аснове апавядання «Рускі» М. Гарэцкага — сцвярджэнне таго, што ў свядомасці такіх герояў, унурыстых, замкнёных у сабе, усё ж такі штосьці адгукаецца, штосьці варушыцца [7, с. 119]. У гэтым пераконваюць аўтарскія рэмаркі, падобныя да наступнай: хворы «заліўся слязьмі так шчыра і жалосна і так доўга, што ніяк не можна было яму не верыць...» [6].

Такім чынам, абодва прааналізаваныя намі творы раскрываюць адну і тую ж тэму — Першай сусветнай вайны — але іх аўтары робяць гэта па-свойму, вырашаючы ў межах розных жанраў розныя мастацкія задачы. А. Гарун асуджае антыгуманны характар вайны ўвогуле, заклікае «чалавека з ружжом» і ў такіх цяжкіх абставінах заставацца перш за ўсё чалавекам, не праліваць кроў дарма, быць літасцівым да слабых і безабаронных. Абодвум творам уласцівы пафас непрымання вайны як вялікай усенароднай трагедыі. М. Гарэцкі праз маральную трагедыю свайго несамавітага героя адкрывае праўду пра вайну, якую вядуць арміі дзвюх імперый, абыякавых да лёсаў чалавечых адзінак. Нават усвядоміўшы і прыняўшы традыцыйны маральны кодэкс салдата, «чалавек з ружжом» пастаўлены ў такія ўмовы, якія вымушаюць яго парушыць і атрымаць у выніку глыбокую душэўную рану. Пісьменнік ацэньвае вайну з пункту гледжання «недзяржаўнага» народа, сыны якога вымушаны ваяваць за чужыя інтарэсы.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Чыгрын, І. П.* Паміж мінулым і будучым : проза М. Гарэцкага / І. П. Чыгрын. — 2-е выд., выпр. — Мн. : Бел. навука, 2003. — 166 с.
2. *Белая, А. І.* Чалавек у плыні часу : Мастацкая канцэпцыя асобы і тыпалогія характараў у беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя : манагр. / А. І. Белая. — Баранавічы : РВА БарДУ, 2009. — 408 с.
3. *Мушынскі, М.* Максім Гарэцкі / М. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. — Мн. : [б. в], 1999. — Т. 1. : 1901—1920 гг. — С. 381—427.
4. *Казбярук, У. М.* Алесь Гарун / У. М. Казбярук // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. —Мн. : [б. в], 1999. — Т. 1. : 1901—1920 гг. — С. 319—334.
5. Сэрцам пачуты звон: Паэзія, проза, драматургія, публіцыстыка / уклад., прадм. і камент. У. Казберука ; маст. У. Басалыга. — Мн. : Маст. літ., 1990. — 358, [1] с., 5 л. партр. : іл. — (Спадчына)
6. Родныя вобразы [Электронный ресурс] // А. Гарун. Рускі. — Режим доступа: http://www.rv-blr.com/litaratura/view/54. — Дата доступа: 10.11.2012. — Загл. с экрана.
7. *Гарадніцкі, Я. А.* Мастацкі свет беларускай літаратуры ХХ стагоддзя / Я. А. Гарадніцкі. — Мн. : Бел. навука, 2005. — 171 с.


Матэрыял паступіў у рэдакцыю 10.12.2012 г.

Репозиторий БарГУ